# *СУСТРЭЧА 3*

# *ЛЮБОЎ, ЯКУЮ ВЫ БУДУЕЦЕ*

«Таму малюся, каб вашая любоў яшчэ больш узрастала ў пазнанні і ва ўсякім адчуванні, каб вы пазнавалі лепшае» (Флп 1, 9).

**1. Уводзіны**

Калі вы прынялі рашэнне заключыць сакрамэнт сужэнства, то вы зрабілі вырашальны крок, які праз усё ваша жыццё будзе вызначаць вам шляхі. Вы аддалі сябе адно аднаму па ўласнай волі, целам і духам, назаўсёды. Гэта рашэнне было абумоўлена любоўю, якая вас злучала. У большасці выпадкаў гэта любоў была нясталай, была быццам толькі закваскай любові. Любоў, якая вас злучыла, павінна ўвесь час узрастаць. Падчас гэтай сустрэчы, у супольнасці, мы задумаемся над значэннем сужэнства, як супольнасці мужчыны і жанчыны, над тым, як развіваць і ўзмацняць любоў у сужэнстве.

**2. Сустрэча суполкі**

## *I ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ* 

- ***Супольны пасілак і дзяленне жыццём***

Мы распачынаем гэтую частку сустрэчы малітвай перад ежай.

Падрыхтоўка да дзялення жыццём патрабуе падсумавання вашага жыцця за апошні месяц і вызначэння, якія падзеі альбо перажыванні маюць для вас асаблівае значэнне. Дадаткова вы прымаеце рашэнне аб тым, што распавядзеце іншым сужэнствам. Гэта значна адрозніваецца ад дэталёвага апісання свайго календара за апошні месяц. Калі мы дзелімся сваім жыццём у праўдзе, то гэта заўсёды з’яўляецца крыніцай узаемнай дапамогі і братэрства.

Пасля заканчэння гэтай часткі сустрэчы мы падрыхтоўваем стол да ўрачыстага запальвання свечкі.

## *II ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*

 ***Малітва супольнасці***

На мінулай сустрэчы мы паказалі вам, як будзе адбывацца малітва супольнасці. Вы дзяліліся сваім досведам малітвы. На гэтай сустрэчы, як і на кожнай наступнай, малітва супольнасці будзе выглядаць падобна. Канешне, вы можаце ўзбагачаць яе такім чынам, які прапануеце, і які будзе прыняты адказнымі і духоўным дарадчыкам суполкі.

Спачатку мы папросім аб дарах Святога Духа, каб усё, што мы будзем рабіць, было згодна з Божай воляй. Пасля мы падзелімся тым, што Бог сказаў нам у сённяшнім Слове. На гэтай сустрэчы мы прапануем разважанне над фрагментам Гімну Любові святога апостала Паўла.

**Гімн Любові (1 Кар 13, 1-8)**

---

Калі я гавару мовамі людзей і анёлаў, а любові не маю, я – як медзь звонкая або гулкія цымбалы.

Калі маю дар прароцтва і спазнаў усе таямніцы, і маю ўсякія веды і паўнату веры, каб перастаўляць горы, а любові не маю, то я – нішто.

Калі раздам усю маёмасць сваю і аддам цела сваё на спаленне, а любові не маю, няма мне з гэтага ніякай карысці.

Любоў доўгацярплівая, любоў ласкавая, не зайздросціць, любоў не пыхлівая,

не ганарыцца, не бессаромная, не шукае свайго, не гневаецца, не памятае зла,

не радуецца несправядлівасці, але радуецца разам з праўдай.

Усё зносіць, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё церпіць.

Любоў ніколі не мінае. Не так як прароцтвы, якія спыняцца, ці мовы, якія змоўкнуць, ці веды, якія скончацца.

---

**Малітва ў інтэнцыях.** Працягваем нашу малітву ў форме спантаннай малітвы. Падзякуем Богу за ўсе атрыманыя дары. Скончым нашу малітву інтэнцыямі, якія мы даверылі нашай супольнасці. Духоўны дарадчык занясе іх да Божага алтара.

**Молімся**
*Божа, ты паклікаў нас стварыць хатні агмень (ачаг);*
*Дай нам ласку ажывіць яго Тваёй любоўю;*
*Няхай ён падтрымлівае ўсіх, хто жыве ў ім;*
*Няхай наш дом будзе гасцінны для ўсіх,*
*Хто захоча ў ім сагрэцца.*
*Навучы нас абодвух дзейнічаць пад Тваёй абаронай,*
*І спаўняць Тваю волю кожны дзень нашага жыцця,*
*І аддаваць табе нашыя намеры, і прасіць аб дапамозе,*
*І ахвяроўваць нашыя радасці і смуткі,*
*І весці да Цябе дзяцей, якіх Ты даў нам у апеку.*
*Божа, Ты, Які з'яўляешся любоўю,*
*Дзякуем Табе за наша каханне.*
*Амэн.*

## *III ЧАСТКА СУСТРЭЧЫ*



### ***Духоўнае жыццё. Паглыбленне веры і любові***

Сужэнскае жыццё – гэта вельмі важная справа. Распачынаць і развіваць яе трэба з перакананнем, што сапраўдную любоў належыць будаваць пастаянна. Гэта праўда, якую мы павінны нястомна сабе прыпамінаць.

У Каталіцкім касцёле на Беларусі сужэнская клятва гучыць наступным чынам: «Я, N. (імя), бяру цябе, N. (імя), за жонку (мужа) і прысягаю табе любоў, вернасць і сужэнскую павагу, і тое, што не пакіну цябе аж да смерці. Няхай дапаможа мне ў гэтым Бог усемагутны ў Тройцы адзіны і ўсе святыя».

- ***Тэкст да абмену думкамі***

На пачатку сужэнскага жыцця (…) пара часта перажывае любоўную еднасць: ёсць жаданне ўсё рабіць разам, падтрымліваць адно аднаго. У такі час цяжка бывае нават маліцца асобна. Мы спрабуем быць «тым ідэальным» для сужэнца альбо стараемся быць прыкладам «ідэальнай хрысціянскай пары», але як сказаў кардынал Даннілс: «Немагчыма ўвесь час хадзіць на дыбачках, бо пачнуцца сударагі».

Выклікі і цяжкасці штодзённага жыцця патрэбныя нам, каб ачысціць любоў ад ілюзій. Пасля гэтага наступае момант, які шмат людзей лічыць сур'ёзным крызісам («крызісам сямі год сужэнства»), але, насамрэч, ён служыць таму, каб зразумець і прызнаць праўду, каб сужэнская любоў стала яшчэ лепш.

Я заўважаю, што ўжо не дыхаю з ім (з ёй) ва ўнісон; што са сваімі цяжкасцямі я адзін (адна) і што ён (яна) мяне не разумее, што супольнае жыццё патрабуе пасвячэння, на якое я зусім не хачу пагаджацца, што я ўжо не з'яўляюся для яго (яе) цэлым светам, і гэта ўзаемна! Калі каротка, то я адчуваю сябе расчараваным (-ай) і глыбока прыніжаным (-ай). Мяне сціскае трывога, што я памыліўся (-лася) і я вінавачу ў гэтым сужэнца.

«Яснасць розуму» становіцца вялікай спакусай: «я цяпер добра цябе ведаю і ў мяне няма ілюзіяў». Ад такога разумення недалёка да абвінавачванняў. Узгадаем Адама і Еву пасля таго, як яны зграшылі. Узгадваем свае крыўды і расчараванні: «яна не разумее; ён са мной не размаўляе…». Пара распалася, але што засталося ад кахання? (…)

Бог чакае нас тут, каб навучыць найважнейшаму: каб злучыцца духам, трэба быць удвух, двое адным целам (Мк 10, 8), а не «адным у адным целе». Чалавечая істота ёсць адзінай і мае ў сабе ўласную таямніцу. Мы ніколі нікога не спазнаем да рэштак, бо няма канца спазнанню. Няхай пашана таямніцы другога чалавека стане шляхам сапраўднага пазнання. Няхай гэта іншая асоба цалкам належыць толькі Богу, перш чым зможа належаць мне, і няхай кожны дзень будзе дадзеная мне праз Яго, а я прыму яе такой, якая яна ёсць, а не такой, якой бы хацеў, каб яна была. Каб не мог яе «схапіць», але каб з дня на дзень пяшчотна «шлюбаваў» яе.

Трэба ўмець знайсці спосаб адкрыць глыбіню сутнасці, распавесці аб сваіх адчуваннях так, каб не пакрыўдзіць другога, не выказвацца: «ты параніў мяне, калі сказаў гэта», а хутчэй «я адчуў сябе параненым, калі ты гаварыў аб гэтым». Трэба хацець дзяліцца з іншым чалавекам. У гэты момант сужэнцам абавязкова патрэбна абменьвацца словамі, нават калі хочацца закрыцца ў маўчанні. (…) Дзень, калі мы скажам адзін аднаму: «Ты маеш права быць тым, кім ты ёсць», калі мы будзем імкнуцца клапаціцца аб іншым чалавеку, не думаючы аб сабе самім, будзе днём перамогі. Любоў, якая пройдзе такі іспыт будзе больш моцнай, ачышчанай. Гэты этап вельмі важны ў стварэнні сжэнскай еднасці.

*(Жаржэта Блак’ер, фрагменты з «Адважыцца жыць любоўю»)*

Як узнікае сужэнская супольнасць? Кожны з нас мае сваю асабістую гісторыю, якая пачалася ў дзяцінстве. Незалежна ад сужэнскага стажу прыглядзіцеся да вашага сужэнства. Зрабіце гэта дома. Адкажыце на прыведзеныя ніжэй пытанні ў вашых сужэнствах. Пытанні на сустрэчу будуць у канцы гэтага тэксту.

*Каханне*

Вы вырашылі разам крочыць па жыцці, бо вас злучыла каханне. Сёння, калі вы ўжо маеце за сабой некалькі год сужэнства, вы разумееце, што вашы ўяўленні аб каханні былі спрошчаныя, калі не сказаць наіўныя. Адкажыце сабе на некалькі пытанняў. Прапанаваных пытанняў шмат. Вы не павінныя адказваць на ўсе пытанні. Можаце выбраць тыя, якія здаюцца вам найважнейшымі.

- Што значыць кахаць?
- Што захапіла нас адзін у адным? Чаму гэта жанчына і гэты мужчына стаў для мяне найважнейшым у жыцці? З чаго ўсё пачалося?
- Што новае, цудоўнае вы ўбачылі ў вашым сужэнцы за час, які прайшоў пасля заключэння шлюбу? Ці стараецеся вы быць адкрытымі адзін для аднаго? Ці паглыбляеце вы ўзаемнае пазнанне адзін аднаго? Ці цікавіць вас, што думае і адчувае ваш сужэнец?
- Ці дзелімся мы нашымі перажываннямі, жаданнямі?
- Ці размаўляем мы аб важных і менш важных справах, якія датычаць нашага сужэнства, дзяцей, сям’і?

*Адрозненні*

Наша сужэнства не павінна знішчаць нашыя асабовасці. Як раз наадварот. Дзякуючы нашаму сужэнству мы павінны развівацца ўсебакова. Гэта важны крытэрый аўтэнтычнасці і сілы саюза. Паспрабуйце падумаць над гэтай тэмай, адказаўшы на некалькі пытанняў:

- Ці бачым мы адрозненні ва ўспрыманні рэчаіснасці і спосабах дзеяння мужчыны і жанчыны, якія вынікаюць з адрозненняў пола і нашай гісторыі?
- Ці клапоцішся ты аб развіцці свайго сужэнца? Якім чынам падтрымліваеш яго ў прыняцці прафесійных выклікаў, прыняцці адказнасці, у культурным развіцці, у адпачынку і забавах?
- Што ты робіш, каб развіваць і ўзбагачаць сваю асобу так, каб ты мог ўзбагачаць свайго сужэнца?

*Развіццё нашага кахання ў розных сферах*

Сужэнская любоў закранае ўсе сферы жыцця. Ці ваша каханне сапраўды шматграннае? Падумайце над гэтай тэмай, карыстаючыся наступнымі пытаннямі:

- Ці наша інтымнае сужыццё, якое з’яўляецца найбольш глыбокім выражэннем любові, будуе нашы ўзаемныя стасункі? Ці дасягнулі мы гармоніі ў сэксуальных стасунках ці мы хаця б імкнемся іх дасягнуць? Ці гэта сфера жыцця з’яўляецца прадметам для нашых размоваў?

- Ці ўмеем мы выражаць свае пачуцці: словамі, поглядамі і чулымі дотыкамі? Ці дзелімся мы радасцямі і смуткамі? Ці падтрымліваем мы адзін аднаго ў цяжкасцях?
- Ці ўзбагачаемся мы ўзаемна нашым інтэлектуальным развіццём? Ці ўмеем мы слухаць сужэнца?
- Ці цікавімся мы справамі сужэнца: працай дома, прафесійнай дзейнасцю, палітычнай, рэлігійнай? Ці падобныя ў нас думкі?

Магчыма вам будзе цяжка адказаць на ўсе пытанні. Аднак варта вяртацца да іх, каб прыглядацца да вашага кахання.

- ***Абмен думкамі на сустрэчы***

  - Ці перажылі мы значныя здарэнні, якія ўзмацнілі наша сужэнства?
  - Аб чым мы зараз клапоцімся, каб узмацняць наша каханне?
  - Што ў штодзённым жыцці найбольш ускладняе нашыя адносіны?

### ***Харызмат Руху і педагогіка***

Размовы, якія не адбываюцца ў прысутнасці Бога, могуць лёгка стаць павярхоўнымі, розум жанглюе намерамі, серца адкідвае праўду, якая заклікае да пераменаў. У END сужэнствы стараюцца быць абсалютна шчырымі; кожная спазнаная праўда павінна ўпісвацца ў жыццё.

Абмен думкамі толькі тады прыносіць плён, калі ён добра падрыхтаваны. Таму сужэнствы павінны разам паглыбіць тэму сустрэчы і прадставіць свае разважанні ў пісьмовай форме сужэнству, адказнаму за правядзенне абмену думкамі, за некалькі дзён перад чарговай сустрэчай. Гэты накладзены на іх абавязак супольнай штомесячнай рэфлексіі можа стаць для іх вельмі плённым

Карта END

Фармацыйная тэма павінна служыць лепшаму пазнанню Божай задумы адносна сужэнства, сям'і, бацькоўства і выхавання дзяцей, месца і ролі хрысціян у сучасным свеце. Яна таксама павінная дапамагчы ў лепшым разуменню таго, чым з'яўляецца хрысціянская любоў, бо нас будуць судзіць з любові.

У сваім высілку сужэнствы, удзельнікі суполкі, не застаюцца сам насам, а наадварот «нязломна верацъ у сілу братэрскай дапамогі». Гэта братэрская дапамога (абмен думкамі) будзе плённай, калі мы перад сустрэчай прачытаем матэрыялы, абдумаем іх кожны асобна, а пасля яшчэ раз супольна прааналізуем прачытаны тэкст.

Плён сваёй працы сужэнства дасылае ў пісьмовай форме адказнай пары, як каментар да абмену думкамі. Гэтыя плёны працы могуць мець розную форму. Могуць быць пытаннем, на якое вы хацелі б, каб усе разам адказалі. Могуць

уключаць вашыя разважанні, якія ўзніклі пасля прачытання тэксту. Могуць спалучаць у сабе гэтыя дзве формы.

Яшчэ некалькі слоў аб формах прапаноў да абмену думкамі на сустрэчы. На практыцы ў розных суполках прапановы маюць розную форму. Звычайна мы бачым два метады працы над фармацыйнай тэмай: пры дапамозе рэфлексій ці каментараў. Аднак мы заўсёды павінны памятаць, што мэтай сустрэчы з'яўляецца наша духоўнае развіццё, а не інтэлектуальныя спаборніцтвы.

Прыняты спосаб працы над фармацыйнай тэмай павінен ажыўляць суполку. Ксёндз Кафарэль у многіх сваіх выказваннях звяртаў увагу на спазнанне, як незвычайна важную крыніцу любові да Бога. Ён кажа так: «Калі хтосьці не ведае Яго жывым спазнаннем, якое ўвесь час абнаўляецца, няхай не думае, што будзе па-сапраўднаму любіць Яго і служыць Яму».

У падрыхтоўцы каментароў вам заўсёды дапамогуць пытанні, прапанаваныя ў тэксце на сустрэчу. Калі вы зразумееце, што нейкія з пытанняў найлепш адпавядаюць вашым чаканням, то просім даслаць іх.

### 3. Заданні на час паміж сустрэчамі 

- **Памятайце аб штодзённым чытанні *Магніфікат*.**
- Прачытайце матэрыялы на чацвёртую сустрэчу, паразмаўляйце на прапанаваную тэму.
- Пастарайцеся адказаць на пастаўленыя пытанні ў чацвёртай сустрэчы.
- Прыміце высілкі, каб прачытаны тэкст уплываў на ваша штодзённае жыццё, каб фармаваў ваша сужэнства.
- Дашліце свае каментары да абмену думкамі на сустрэчы.
- Падрыхтуйцеся ў сужэнстве да дзялення жыццём.
- Дамоўцеся, што было для вас найважнейшым за мінулы час і чым бы вы хацелі падзяліцца з іншымі сужэнствамі.
- Дашліце адказнаму сужэнству інтэнцыю, якую вы даверыце суполцы.